**Воранаўская раённая бібліятэка**

19.07 Камп'ютарнае падарожжа “Хочаш ведаць пра ўсё на свеце — пакапайся ў Інтэрнэце” прайшло ў Воранаўскай раённай бібліятэцы. Дзеці, змаглі пазнаёміцца з гісторыяй узнікнення кампутара, даведацца шмат цікавых навін аб Інтэрнэце, паспрабаваць самастойна знайсці адказы на пытанні на розных сайтах, былі дадзены рэкамендацыі па працы з Інтэрнэтам і яго рэсурсамі.

Бібліёграф пазнаёміла з літаратурай аб кампутарнай пісьменнасці, якая ёсць у кніжным фондзе і можа аказаць істотную дапамогу ў набыцці навыкаў працы з кампутарам.

26.08. У Воранаўскай раённай бібліятэцы адбылася сустрэча з прадстаўніком натарыяльнай канторы Воранаўскага раёна Масюкевіч Таццянай Іванаўнай. На сустрэчу прыйшлі ўдзельнікі аматарскага аб'яднання “Надзея”, а таксама чытачы бібліятэкі. Прысутных цікавіла цэлы шэраг пытанняў, бо атрымаць бясплатную прававую кансультацыю ў спецыяліста атрымоўваецца не кожны дзень. Натарыус параіла, што лепш: завяшчанне або дарэнне, як правільна аформіць даверанасць і як можна ўступіць у спадчыну, як захаваць маёмасць ад замахаў і дамаганняў трэціх асоб, і шмат іншых пытанняў. У канцы мерапрыемстваў Таццяна Іванаўна пакінула свае памяткі і буклеты, а таксама пажаданне ўсе юрыдычныя пытанні вырашаць у законным парадку.





01.09. Першы школьны ўрок для вучняў 5-х класаў Воранаўскай сярэдняй школы прайшоў у аддзеле абслугоўвання і інфармацыі на тэму “ У гістарычнай памяці сіла і адзінства беларускага народа”. Урок прысвечаны памятным падзеям і дзяржаўных святаў – Дня народнага адзінства, Хатынскай трагедыі, Дню яднання народаў Беларусі і Расіі, 9 мая.

08.09 У аддзеле абслугоўвання і інфармацыі, для вучняў 7-га класа, прайшла гадзіна краязнаўства “Вялікай Радзімы няма без малой”, прысвечаная 190-годдзю з дня нараджэння Людвіка Нарбута, імя якога звязана з Воранаўскім раёнам.

15.09 У Воранаўскай раённай бібліятэцы прайшло ўрачыстае мерапрыемства» няхай і ў XXI стагоддзі гучыць хвала бібліятэцы", прысвечанае Дню бібліятэк Беларусі.





**27.09** Аддзел абслугоўвання і інфармацыі "Воранаўскай раённай бібліятэкі" правёў гадзіну бяспекі "Бяспека нам патрэбна— бяспека нам важная". На мерапрыемства былі запрошаны вучні 4 класа. Інспектар МНС Вадзім Юр'евіч Хлюст патлумачыў дзецям асноўныя правілы бяспечных паводзін у побыце; як фарміраваць уменні бачыць небяспеку ў паўсядзённым жыцці і ўменне яе папярэдзіць; даў уяўленне аб негатыўных наступствах для жыцця і здароўя пры няведанні або незахаванні правілаў бяспекі; як выхоўваць асцярожнасць і ўменне адказваць за свае ўчынкі.
Дзеці прагледзелі відэаролік і замацавалі веды адказамі на пытанні. У заключэнне Вадзім Юр'евіч раздаў памяткі, закладкі і прапанаваў навучэнцам ўсталяваць мабільнае прыкладанне "МНС Беларусі: дапамога побач".

**28.09** Аддзел абслугоўвання і інфармацыі правёў з удзельнікамі аматарскага аб'яднання "Непаседы" урок здароўя "Верны сябар і кампаньён— твой здаровы рацыён". Бібліятэкар сканцэнтравала ўвагу дзяцей на каштоўнасцях здароўя, і як працаваць над фарміраваннем звычкі ёсць тое, што патрабуецца арганізму, а не тое, што хочацца есці. Пашырылі веды дзяцей аб карысных прадуктах і вітамінах, якія змяшчаюцца ў іх.У заключэнні дзеці з радасцю прынялі ўдзел у конкурсе "Угадай вітаміны", "Пазнай па апісанню" і адгадванні загадак на пытанні віктарыны.

**Да Году гістарычнай памяці**

Бібліятэкар філіяла "Больцішская інтэграваная сельская бібліятэка" правяла для вучняў ДУА "Больцішская базавая школа" ўрок на тэму "Гістарычная памяць – дарога ў будучыню!". На уроку навучэнцы школы гаварылі аб тым, як шматгранна гісторыя нашай Беларусі, як многа трагічных і гераічных старонак ў яе гісторыі, аб тым, што нам заўсёды было чым ганарыцца. Увесь змест першага ўрока быў накіраваны на фарміраванне ў дзяцей уяўлення аб гераічнай спадчыне як важнейшым складніку гістарычнай памяці, на фарміраванне грамадзянскай пазіцыі.
1 верасня бібліятэкар філіяла "Канвелішская сельская бібліятэка" наведала вучняў ВПК "Канвелішскія яслі-сад сярэдняя школа" каб павіншаваць з Днём ведаў і правяла ўрок "Гістарычная памяць – дарога будучыню" і запрасіла нававедаць бібліятэку, пазнаёміцца з кніжнымі навінкамі.



Напярэдадні святкавання Дня народнага адзінства, у Воранаўскай раённай бібліятэцы прайшоў гістарычны экскурс " У адзінстве народа—сіла краіны!" для навучэнцаў 10 "А" класа Воранаўскай сярэдняй школы. Вядучыя мерапрыемства расказалі пра гісторыю свята, што менавіта ў гэты дзень - 17 верасня 1939 года стала

пачаткам ўз'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі, падзеленай у 1921 годзе, калі паводле ўмоў Рыжскага мірнага дагавора. Далей удзельнікі мерапрыемства здзейснілі завочнае падарожжа па Беларусі. Удзельнічалі ў розных віктарынах “Беларусь культурная”, “Гарады Гродзенскай вобласці”, “Беларусь. Малая радзіма”, “Гонар Беларусі”. У ходзе мерапрыемства, супрацоўнікі бібліятэкі, прадставілі дзецям відэаролік “ Беларусь. Гісторыя” і слайд-прэзентацыю “Помнікі Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі”. У бібліятэцы аформлена кніжная выстава “У адзінстве сіла народа краіны”.

## Дзень беларускага пісьменства

З нагоды Дня беларускага пісьменства ў філіяле “Місявіцкая сельская бібліятэка” праведзена гадзіна цікавага паведамлення “Шляхам асветніка Скарыны” для вучняў 2-3 класаў. Бібліятэкар Лілія Карпук распавяла пра гісторыю беларускага пісьменства, пра знакамітага прадстаўніка кніжнай асветы Францыска Скарыну, яго жыццёвы і творчы шлях, а таксама пазнаёміла з тэматычнай літаратурай прадстаўленай на кніжнай паліцы.

У першую нядзелю верасня штогод у Беларусі адзначаюць Дзень беларускага пісьменства. Менавіта ў кнігах, у “Прыгожым пісьменстве”, у словах паэтаў і мысліцеляў адлюстроўваецца гісторыя народа, яго слаўныя справы. Беларусам ёсць чым ганарыцца — беларускае пісьменства мае шматвяковыя традыцыі. Вядомыя асветнікі беларускага народа — гэта Францыск Скарына, Кірыл Тураўскі,таксама Еўфрасіння Полацкая, Сімяон Полацкі.

У філіяле “Радунская гарпасялковая бібліятэка” адбыўся агляд літаратуры “У вытоках беларускага друкавання” на якую былі запрошаны вучні ДУА “Радунская сярэдня школа”. Дзеці пазнаёміліся з гісторыяй і традыцыямі свята Дзень беларускага пісьменства, прасачылі шлях, які прайшла кніга на беларускай зямлі, бліжэй пазнаёміліся з жыццём і дзейнасцю беларускіх асветнікаў. Праверыць свае веды школьнікі змаглі адказаўшы на пытанні віктарыны “Ад буквы да кнігі”. Таксама прысутныя пазнаёміліся з творамі для дзяцей і падлеткаў сучасных беларускіх пісьменнікаў, адкрылі для сябе новыя імёны ў беларускай літаратуры.

У філіяле “Бастунская сельская бібліятэка” была аформлена выстава – рэклама “Вітаю цябе, беларуская кніга", на якой прадстаўлены розныя творы беларускіх пісьменнікаў і паэтаў.

Бібліятэкар філіяла “Тракельская сельская бібліятэка” правяла інфармацыйна-пазнавальную гадзіну “Спадчына беларускіх асветнікаў”. Удзельнікі пазнаёміліся з гісторыяй развіцця пісьменства на беларускай зямлі, з імёнамі асветнікаў, іх высакароднымі справамі. Затым была праведзена віктарына “Гісторыя роднага слова”.

Урок гісторыі “Як да нас прыйшла кніга” для юных чытачоў прайшоў у філіяле “Гіркаўская сельская бібліятэка”.

## ПРАЕКТ "Библиотека-city"



У філіяле “Бастунская сельская бібліятэка” прайшоў “Кніжны пікнік з кнігай лета весялей” у рамках праекта “Бібліятэка-city” для дзяцей аздараўленчага лагера “Колокольчик” ДУА ВПК “Бастунскія яслі-сад-базавая школа”.

Бібліятэкар філіяла “Забалацкая інтэграваная сельская бібліятэка” правяла гульню-віктарыну “У краіне дзяцінства “для дзяцей ДУА “ВПК Забалацкія яслі-сад-сярэдняя школа”.



Лета-самая яркая пара года. А ў дзяцей летам самыя доўгія вакацыі, і гэта дае магчымасць назіраць за ўсімі цудамі прыроды, чаргуючы вясёлыя гульні, вандроўкі і вядома ж чытанне кніг. У рамках праекта “Бібліятэка-city” у філіяле “Радунская гарпасялковая бібліятэка” пад адкрытым небам правяла чытацкі марафон” “Кніга пад сонцам”. У гэты дзень для дзяцей былі прадстаўлены навінкі, якія паступілі ў бібліятэку. А асаблівая ўвага нададзена новай кнізе з серыі “Сонечны зайчык”, прысвечаная порам года “Усе фарбы лета”. Дзеці слухалі вершы, апавяданні і казкі сучасных аўтараў, з гэтай кнігі, а таксама разгадвалі загадкі і рэбусы, прадстаўленыя ў гэтай кнізе.

Што можа быць лепш кніжкі з дзіўна прыгожымі ілюстрацыямі? Для дзяцей у філіяле “Пераганцаўская сельская бібліятэка” прайшоў літаратурны калейдаскоп “Давайце знаёмыя кніжкі адкрыем”. Дзеці знаёміліся з кніжкамі, з захапленнем разглядалі ілюстрацыі. Усім спадабалася і літаратурная віктарына, удзельнікі ўспаміналі казкі і навыперадкі адказвалі на пытанні.

У філіяле “Бастунская сельская бібліятэка” прайшла літаратурная гульня “Летні кніжны круіз”. Увазе дзяцей былі прадстаўлены кнігі і часопісы, якія ёсць у бібліятэцы. Госці атрымалі кароткія каментары па кожнай групе выданняў. Дзеці прынялі актыўны ўдзел у гульні-віктарыне “Падарожжа па старонках любімых кніг” і вясёлых конкурсах, прапанаваных бібліятэкарам. Каб адказаць на пытанні, удзельнікам выпрабаванняў неабходна было арыентавацца ў свеце дзіцячай літаратуры.

У канцы мерапрыемства бібліятэкар прапанавала дзецям пагартаць і ўзяць пачытаць дома рэкамендаваныя кнігі.

## ЛЕТНІЯ КНІЖНЫЯ МАРШРУТЫ



У філіяле “Нацкая сельская бібліятэка” прайшоў літаратурны рынг “У коле любімых кніг: героі на экране” з дзецьмі лагера пры ДУА “ВПК Нацкія яслі-сад-сярэдняя школа”.

Экскурсія “Дом, дзе жывуць кнігі”для выхаванцаў ДУА

яслі - сад аг.Беняконі”  у філіяле “Беняконская сельская бібліятэка –музей этнаграфія”.

Воранаўскую раённую бібліятэку наведалі дзеці ДУА “Яслі-сад аг.Паляцкішкі”. Супрацоўнікі аддзела абслугоўвання і інфармацыі прапанавалі малым здзейсніць займальнае падарожжа ў свет кніг. Дзеці з задавальненнем слухалі чытанне апавяданняў, вершаў, казак, гарталі старонкі новых кніг, удзельнічалі ў віктарыне і адказвалі на казачныя пытанні.

“Чытаючы прыпынак” пад такой назвай прайшла чарговая сустрэча супрацоўнікаў бібліятэкі з чытачамі ў “Бібліяскверыку”.

У філіяле “Пераганцаўская сельская бібліятэка” прайшоў літаратурны рынг “Казка ў госці зазірнула”. Бібліятэкар пазнаёміла дзяцей з дзіўнай краінай літаратуры, у гульнявой форме ўспаміналі змест кніг і вершы дзіцячых пісьменнікаў, адгадвалі хто прамаўляў чароўныя загаворы, у каго ператвараліся або былі зачараваны героі казак, называлі другую частку імя кніжнага персанажа.

Бібліятэкар філіяла “Доцішская сельская бібліятэка” для дзяцей падрыхтавала летні чытальны зал “Кніга пад сонцам”. Дзеці мелі магчымасць выбраць кнігу і пазнаёміцца з часопісамі.

“Лета і кніга ў слаўным дуэце” для выхаванцаў дзіцячага садка прайшла ў філіяле “Тракельская сельская бібліятэка”

У філіяле “Больцініцкая сельская бібліятэка” для дзяцей была праведзена конкурсная праграма “Мы сябры прыроды”. З аповеду бібліятэкара аб прыгажосці навакольнага нас прыроды і неабходнасці беражлівых да яе адносіны, удзельнікі даведаліся, якую ролю гуляе чалавек у ахове прыроды. Юныя чытачы прынялі ўдзел у віктарыне “Ззнаўцы прыроды” актыўна адказвалі на прапанаваныя пытанні, даведваліся гукі прыроды і высвятлялі, якія жывёлы і расліны занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі, разгадвалі загадкі, удзельнічалі ў конкурсе прыказак і прымавак.



Казкі любяць усе дзеці: чараўніцтва і прыгоды захапляюць, забаўляюць і вучаць дабру і справядлівасці. І, вядома ж, у дні летніх канікул немагчыма абысціся без казак. Чытачы філіяла “Гіркаўская сельская бібліятэка” прыйшлі на гучныя чытанні пад сонцам “У гасцях у казкі”, каб разам з гаспадыняй кніжнага дома прайсці па дарозе казак, пазнаёміцца з новымі і ўспомніць старыя казкі, даведацца шмат новага і цікавага. У рамках дня юныя чытачы здзейснілі літаратурна-пазнавальнае падарожжа па кніжнай выставе “Усе казкі ў госці сабраліся”. Дзеці чыталі казкі выдатных дзіцячых пісьменнікаў: Аляксандра Пушкіна, Пятра Яршова, Ганса Хрысціяна Андэрсана, Шарля Перо і, вядома ж, успомнілі беларускія, рускія народныя казкі, бо менавіта з іх пачынаецца першае знаёмства дзіцяці з мастацкай літаратурай. Дзеці з задавальненнем

прынялі ўдзел у казачнай віктарыне “Казкі – нашы сябры” і прадэманстравалі выдатныя веды, як беларускіх, рускіх, так і замежных казак, бо Краіна казак-самая дзіўная і цудоўная краіна з усіх.

У філіяле “Больціціцкая сельская бібліятэка” добры настрой падарыла дзецям літаратурнае лато “Ехалі з горкі скарагаворкі...” (конкурс загадак, крыжаванак) і віктарына “Знаўцы прыроды”.

Мы ўсе з дзяцінства любім казкі. Казкі вучаць нас жыццю, распавядаюць пра дабро і зло, дапамагаюць спазнаць свет. У рамках праграмы летняга чытання ў філіяле “Переганцаўская сельская бібліятэка” прайшлі літаратурныя чытанні “ Карагод цудоўных казак”. Юныя чытачы з задавальненнем прынялі ўдзел у віктарыне, дэманструючы неверагодную эрудыцыю, адгадвалі загадкі. Падарожжа ў казку скончылася, але казка заўсёды застаецца з чытачом, варта толькі ўзяць кніжку ў бібліятэцы, адкрыць яе і прачытаць.

Лета-любімае пара года дзяцей. У дні летніх канікул у дзяцей з’яўляецца маса вольнага часу, якое яны могуць прысвяціць свайму адпачынку, зносін, занятку любімай справай. І, несумненна, адным з важных і прыемных для дзяцей заняткаў з’яўляецца чытанне. Бібліятэкар філіяла “Забалацкая інтэграваная сельская бібліятэка” пад адкрытым небам, правяла з дзецьмі чытацкі марафон “Летам няма калі сумаваць, будзем кнігі мы чытаць!”. Дзеці, зручна ўладкаваўшыся, размаўляючы, з задавальненнем чыталі кнігі. З імі былі праведзены віктарыны: “Назаві літаратурнага героя”, “Хто напісаў тэлеграму?”, “Ці ведаеце вы казкі?”. Асабліва цікава прайшла гульня-віктарына “Хто разумнейшы за ўсіх?”.

Сустрэча з казкай заўсёды свята. Бо казкі вучаць быць разумнымі і добрымі, сумленнымі і працавітымі, дружнымі і смелымі. Яны вучаць, як перамагчы зло, хлусню, падступства, ніколі не губляць веру ў поспех, любіць сваю Радзіму і абараняць - слабых. Выдуманы казачны свет заўсёды нясе з сабой мудрую думку. Нездарма кажуць “Казка хлусня, ды ў ёй намёк! Добрым малайчынам урок”. Бібліятэкар філіяла “Бастунская сельская бібліятэка” правяла чарговы бібліятэчны дэсант “Сустрэча з казкай”для дзяцей малодшага ўзросту.

З 17 па 21 жніўня ў філіяле “Місявіцкая сельская бібліятэка” праходзіла акцыя для дзяцей і падлеткаў “Свет чытання — маладым” з мэтай прыцягнення новых чытачоў у бібліятэку. З інфармацыяй аб правядзенні акцыі дзеці былі азнаёмленыя загадзя. У рамках акцыі ў бібліятэцы кожны дзень праходзілі мерапрыемствы па розных тэмах, такія як: інтэрактыўная гульня пра жыццё і творчасць Я.Купалы і Я. Коласа “Славутыя класікі”, міні віктарына “Загадкі прыроды”, літаратурная гульня па кнігах Рыгора Остэра “Паслухмяным дзецям чытаць забараняецца”, урок бяспекі “Бяспека ў летні перыяд”, спартыўна-забаўляльная праграма “Адзін за ўсіх і ўсе за аднаго”.

Гульнёвая праграма “Лета! Ура!” ў філіяле “Гіркаўская сельская бібліятэка” пачалося з чытання вершаў пра лета, дзеці ўспомнілі прыказкі і

прымаўкі. Затым пачалося сапраўднае весялосьць, дзеці з задавальненнем прынялі ўдзел у гульнях і конкурсах. Усе ўдзельнікі свята засталіся задаволеныя, і пайшлі з добрым настроем.

Бібліятэкар філіяла “Тракельская сельская бібліятэка” запрасіла дзяцей на літаратурна-гульнёвую праграму “Мы з сябрамі не сумуем, а чытаем і гуляем” Дзеці з вялікім задавальненнем паслухалі павучальныя, дасціпныя, вясёлыя і добрыя казкі, з задавальненнем адгадвалі загадкі па казках. Кожны з іх імкнуўся паказаць сваё веданне, ацэньваў сябе, наколькі добра ведае любімыя казкі.

Казкі любяць усе: і дарослыя, і дзеці. Няма нічога цікавей казак, як няма нічога цікавей, чым падарожжа ў краіну казак. У свет чароўных і добрых казачных цудаў акунуліся чытачы філіяла “Радунская гарпасялковая бібліятэка” на кніжным асарці “Казкі свету”. Бібліятэкар прачытала “ незвычайную”,“новую казку”, “салат з казак”, а затым дзеці называлі герояў “новай казкі” і ўспаміналі з якіх вядомых казак яны да нас прыйшлі. Аб любімых героях з казак: “Курачка ряба”, “Калабок”, “Воўк і ліса”, “Рэпка”, “Баба-яга”, “Чырвоная Шапачка”, “Дзюймовачка”, “Папялушка” распавяла бібліятэкар. Дзеці з задавальненнем інсцэніравалі казку “Церамок”.

У філіяле “Пагародзенская сельская бібліятэка” прайшоў дзень адчыненых дзвярэй пад назвай “БІБЛІЯТЭКА – чароўнае месца, дзе кнігам не сумна, дзе ўсё цікава” для дзеці старэйшай групы Пагародзенскага дзіцячага садка.

## БЕЛАРУСЬ- МАЯ АЙЧЫНА
## (3 ліпеня-Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь)

У бібліятэках раёна прайшлі мерапрыемствы да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Інфармацыйная гадзіна “Беларусь- жыццё майго крыніцы” (ф-л “Нацкая сельская бібліятэка”); кніжная выстава “Край мой - гонар мой” (ф-л “Радунская гарпасялковая бібліятэка”); кніжная выстава “ Адной табой ганаруся ” (ф-л “Бастунская сельская бібліятэка”).



## ЛІТАРАТУРНАЯ-ЮБІЛЕЙНАЯ СТАРОНКА

### *Да 140 –годдзя з дня нараджэння Я.Купалы*

“Янка Купала, песню зямля ўскалыхала…” гэта адзін з радкоў верша паэта Уладзіміра Някляева, які ён прысвяціў класіку беларускай літаратуры Янку Купалу. Песняру зямлі беларускай, як яшчэ называюць паэта і пісьменніка нашай краіны, было прысвечана чарговае мерапрыемства, якое прайшло ў філіяле “Пераганцаўская сельская бібліятэка”. Бібліятэкар засяродзіла ўвагу прысутных дзяцей на юбілейнай даце выхаду ў свет першага зборніка Янкі Купалы “Жалейка”.Дзеці вельмі ўважліва слухалі цікавы аповед пра жыццё і

творчасць Янкі Купалы. Некаторыя з іх пранікнёна чыталі вершы паэта, выказвалі сваё разуменне пачутых твораў.

“Толькі слова пявучае вечна” менавіта такой была тэма літаратурнай гасцёўні ў філіяле “Тракельская сельская бібліятэка”. Бібліятэкар пазнаёмілі прысутных з жыццём і творчай дзейнасцю знакамітага Беларускага паэта.На працягу мерапрыемства гучалі вершы Купалы і была падрыхтавана кніжная выстава “Зорка зямлі беларускай”.




У філіяле “Гіркаўская сельская бібліятэка” прайшоў паэтычны вернісаж “Пясняр зямлі беларускай”. Творчасць Янкі Купалы – летапіс жыцця беларускага народа, адбітак нацыянальнага характару. Яго самабытныя творы адрозніваюцца высокай нотай духоўнасці. З цікавасцю прысутныя прайшлі пуцявінамі жыцця і творчасці Янкі Купалы. Гучала цудоўная беларуская мова, госці мерапрыемства чыталі вершы класіка.

Супрацоўнікі аддзела абслугоўвання і інфармацыі Воранаўскай раённай бібліятэкі запрасілі жыхароў пасёлка на гучныя чытанні “Гучы ў вяках, слова Купалы”.

У філіялах ДУК “Воранаўская раённая бібліятэка” прайшлі наступныя мерапрыемствы:літаратурнае падарожжа “Купалаўскі вянок” (ф-л “Канвелішская сельская бібліятэка”); паэтычны вернісаж “Не змоўкне голас песняра” (ф-л “Доцішская сельская бібліятэка”); літаратурна-музычная кампазіцыя “Беларускай песні ўладар” (ф-л “Нацкая сельская бібліятэка”); флэшбук “Ён з народа выйшаў, жыў з народам, і ў народзе будзе жыць” (ф-л “Пагародзенская сельская бібліятэка”); літаратурная вандроўка “Купала голос народа” (ф-л “Больцішская інтэграваная сельская бібліятэка”)

У філіяле “Забалацкая інтэграванная сельская бібліятэка” адбыліся літаратурныя чытанні пад назвай “Купалаўскі вянок”. Прысутныя заслухалі біяграфію пісьменніка, успомнілі вядомыя і пазнаёміліся з незнаёмымі фактамі з жыцця Янкі Купалы. Кожны з прысутных, прачытаўшы свой любімы Купалаўскі верш.

***Да 105 –годдзя з нараджэння Я.Брыля***

4 жніўня споўнілася 105-год з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі, класіка нацыянальнай літаратуры — Янкі Брыля**,** з мэтай папулярызацыі твораў Янкі Брыля у філіялах ДУК “Воранаўская раённая бібліятэка” прайшлі мерапрыемствы:літаратурнае знаёмства “Аб жыцці і творчасці Янкі Брыля”(Радунская ГПБ); літаратурная вандроўка “Вандроўка з Янкам Брылём” (Пераганцаўская СБ); літаратурны партэр “Думаючы пра вечнае,бачыў штодзённае” (Нацкая СБ); гучныя чытанні “Гучаць чароўныя радкі” (Забалацкая ІСБ). Бібліятэкары расказалі аб жыцці і творчасці пісьменніка, засярodзілі ўвагу на рамане “Птушкі і гнёзды”, у якім закранаецца тэма духоўных каштоўнасцей людзей, апынуўшыхся ў нечалавечых умовах у

гады Вялікай Айчыннай вайны. На кніжнай выставе былі прадстаўлены творы аўтара.

***Да 100-годдзя з дня нараджэння Максіма Танка***

Для ўдзельнікаў аматарскага аб’яднання “Калачольчык” прайшло чарговае паседжанне - гадзіна паэзіі “Максім Танк – дзецям” у філіяле “Радунская гарпасялковая бібліятэка”. Бібліятэкар пазнаёміла з кнігамі аб яго жыцці і творчасці, напісанымі для дзяцей. Пасля праслухвання твораў дзеці разам з бібліятэкарам іх абмеркавалі, вызначыўшы іх галоўных герояў і тэму, пра што распавядаў аўтар.

## ЗДАРОВЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ

У рамках мэтавай праграмы “Быць здаровым-гэта здорава” бібліятэкар філіяла “Переганцаўская сельская бібліятэка” правяла гутарку “Алкоголь-злейший порок человечества”. У ходзе мерапрыемства прысутныя даведаліся шмат цікавых фактаў з гісторыі адносіны розных народаў да алкаголю ў розныя эпохі, успомнілі і даведаліся прыказкі, прысвечаныя алкагольным напоям, пачулі жахлівыя лічбы, за якімі крыюцца тысячы зламаных людскіх лёсаў. Мерапрыемства было накіравана на фарміраванне негатыўнага стаўлення да шкодных звычак. Бібліятэкар паспрабавала растлумачыць як уплываюць на наш арганізм наркотыкі і алкаголь.

У філіяле “Бастунская сельская бібліятэка” у рамках рэалізацыі мэтавай праграмы “Быць здаровым - гэта здорава” для ўдзельнікаў аматарскага аб’яднання “Знахарка” была арганізавана выстава - парада “Спорт — дарога да здароўя і прыгажосці”. Бібліятэкар распавяла пра карысць руху і комплексах аздараўленчых практыкаванняў, аб здаровым харчаванні, аб масажы, як сродку прафілактыкі захворванняў, пазнаёміла з самымі распаўсюджанымі відамі спорту для людзей сталага ўзросту — гэта хада, лыжы, шахматы і інш.Таксама пагаварылі пра тое, як супрацьстаяць стрэсам і пра сакрэты даўгалецця.

Здароўе-самая вялікая каштоўнасць чалавека. Ад таго наколькі беражліва мы да сябе ставімся, залежыць наша самаадчуванне на працягу ўсяго жыцця. Асновы здаровага ладу жыцця закладваюцца ў нас яшчэ ў дзяцінстве. Неабходнасць сачыць за сабой, пазбягаць шкодных уздзеянняў навакольнага асяроддзя, выконваць рэжым дня і выконваць іншыя паўсядзённыя правілы павінна ўвайсці ў звычку. Менавіта на фарміраванне такіх навыкаў быў праведзены пазнавальна-гульнёвы час “Здароўе даражэй багацце” для ўдзельнікаў аматарскага аб’яднання “Здаравячок” пры філіяле “Тракельская сельская бібліятэка”.

## АКЦЫІ

Як вядома, роля сям'і ў развіцці дзіцяці з'яўляецца вызначальнай, бо сям'я – гэта калыска найвялікшых пачуццяў – любові, узаемаразумення і адказнасці. Сямейнае чытанне-выдатная традыцыя, поспех якой цалкам залежыць ад дарослых, бо менавіта з нас бяруць прыклад дзеці. Кнігі ўзбагачаюць духоўны свет нашых дзяцей, забяспечваюць markdown рознабаковае развіццё.

У філіяле "Радунская гарпасялковая бібліятэка " прайшла акцыя " Усёй сям'ёй у бібліятэку", мэта якой – адраджэнне традыцый сямейнага чытання і прыцягненне дзяцей і бацькоў у бібліятэку. Бібліятэкары зачытвалі чытачам прыказку "Чытайце дзецям не натацыі, а кнігі" прапаноўваючы ім выбраўшы кнігу і пачытаць разам з дзецьмі ў бібліятэцы. Юным чытачам для азнаямлення былі прапанаваны маляўнічыя дзіцячыя кнігі і лепшыя дзіцячыя часопісы. Дзеці ахвотна размаўлялі, распавядалі пра свае любімыя кнігі і герояў, разглядалі маляўнічыя ілюстрацыі новых кніг, прапанаваных бібліятэкарам для сямейнага чытання. А бацькі слухалі парады аб карысці чытання ў коле сям'і, аб тым, што чытаць дзецям і падлеткам. Юным чытачам было прапанавана паўдзельнічаць у інтэрактыўнай гульні. Дзеці, атрымаўшы заданні, перамяшчаліся па паказаным маршруце па бібліятэцы, знаходзілі патрэбныя пункты і, дабраўшыся да фінішу – змаглі даведацца і прачытаць галоўную фразу "Сям'я і кніга – чытаем разам".



Бібліятэкар распавяла, што сумеснае чытанне і імправізацыя казак - гэта зусім нездарма страчаны час, а можа стаць добрай, сямейнай традыцыяй, якая стварае цёплую атмасферу ў доме і даверныя адносіны паміж членамі сям'і. Пажадала бацькам творчых знаходак і памятаць, што чытанне і гульня маюць вялікае значэнне ў працэсе маральнага і эмацыйнага развіцця дзіцяці.

## АМАТАРСКІЯ АБ'ЯДНАННІ

У філіяле "Канвелішская сельская бібліятэка" для ўдзельнікаў аматарскага аб'яднання "Скарбніца" прайшло займальнае мерапрыемства для дзяцей па пляценні з саломкі – традыцыйнага для Беларусі віду дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Дзеці пазнаёміліся з гісторыяй узнікнення гэтага рамяства, з тэхналогіяй апрацоўкі саломкі, убачылі цудоўныя ўзоры вырабаў з цудоўнага прыроднага матэрыялу. Бібліятэкар правяла агляд літаратуры па дадзенай тэме і дзякуючы ўроку майстэрства ад бібліятэкара, дзеці адчулі пластычнасць і прыгажосць саломкі. Здавалася б, простыя прыёмы запатрабавалі ад дзяцей немалых намаганняў, лагічнага мыслення і спрыту. Дзеці, задаволеныя творчым працэсам, панеслі з сабой не толькі новыя веды, але і цудоўныя сувеніры з

саломкі.

6 жніўня ў філіял “Канвелішская сельская бібліятэка” на дзень творчасці “Тэрыторыя майго захаплення” сабраліся ўдзельнікі аматарскага аб’яднання “Скарбніца”.Каб абудзіць у дзяцей цікавасць да працы з рознымі відамі прыроднага матэрыяла, вырашылі зрабіць Лесавічка. Спатрэбіліся шышкі ёлкі і сасны,шалупінне розных відаў арэхаў, сухія галінкі. Прырода нам дорыць шмат усяго, трэба толькі ставіцца да яе беражліва і не нашкодзіць сваімі адносінамі.

Здароўе - бясцэнны здабытак не толькі кожнага чалавека, але і ўсяго грамадства. Пры сустрэчах, растаннях з блізкімі і дарагімі людзьмі мы жадаем ім добрага і моцнага здароўя, бо гэта - асноўная ўмова і заклад паўнавартаснага і шчаслівага жыцця. Здароўе-гэта не толькі адсутнасць хвароб, але і фізічная, сацыяльная і псіхалагічная гармонія чалавека. А таксама добразычлівыя адносіны з людзьмі, прыродай, нарэшце, самім сабой. У рамках мэтавай праграмы “Быць здаровым-гэта здорава” у філіяле “Бастунская сельская бібліятэка” для ўдзельнікаў аматарскага аб’яднання “Знахарка”прайшла гадзіна карыснага савета “Слагаемые здоровья”. Чытачы пазнаёміліся з літаратурай па здароваму ладу жыцця, а таксама даведаліся аб тым, што ўплывае на здароўе і чым яго можна ўмацоўваць.

Для ўдзельнікаў аматарскага аб'яднання “Здаравячок” бібліятэкар філіяла “ Тракельская сельская бібліятэка” правяла гадзіну карысных саветаў “Слагаемые здоровья”. Пагаварылі пра тое, як важна правільна харчавацца, выконваць гігіену і рэжым дня, займацца спортам. Далей былі праведзены рухомыя і слоўныя гульні, хвілінкі пытанняў і адказаў, адгадваньня загадак пра здароўе і спорце. Усе ўдзельнікі атрымалі масу станоўчых эмоцый, зарад бадзёрасці і добры настрой.



## ЗАЛАТАЯ ВОСЕНЬ ЖЫЦЦЯ

Бібліятэкар філіяла “Бастунская сельская бібліятэка” наведала аддзяленне кругласутачнага знаходжання сталых людзей і інвалідаў вёскі Бастуны з аглядам літаратуры “Шляхамі мужнасці і славы”, прысвечаны Году гістарычнай памяці. Важная роля па адраджэнню беларускай народнай культуры належыць у адраджэнні народных святаў і абрадаў, якія прыйшлі да нас з далёкіх часоў і маюць цікавую гісторыю ўзнікнення. Праходзіў час, мяняліся людзі і іх жыццё, а традыцыі і звычаі, звязаныя з абрадамі і святамі, засталіся непадуладнымі часу і дайшлі да нас.Бібліятэкар філіяла “Бастунская сельская бібліятэка” правяла фальклорную гадзіну “Народныя абрады” у аддзяленні кругласутачнага знаходжання сталых



людзей і інвалідаў вёскі Бастуны. Ірэна Яўгеньеўна апавядала прысутнічым аб правядзенні беларускіх святаў і абрадаў, адкуль пайшла традыцыя святкаваць святы і як раней святкавалі іх. Закончылася мерапрыемства конкурсам прыказак “Хто больш ведае”.

У філіяле “Тракельская сельская бібліятэка” адбыўся інфармацыйны час “Як зберагчы здароўе” для людзей пажылога ўзросту. Прысутныя праверылі свае веды ў віктарыне “Спорт,маладосць,здароўе” і пазнаёміліся з кнігамі і часопісамі пра здароўе.

Самая лепшая рэклама кнігі гэта індывідуальная сустрэча з чытачом. Як правіла, гэта падстава для прыватных гутарак, прыёму і выканання індывідуальных заказаў. А значыць-эфектыўны спосаб папулярызацыі кнігі. “С глазу на глаз” называецца. І гэтую сустрэчу можна назваць “агульным рэкламным днём кнігі”. Так, 8 верасня філіялам “Місявіцкая сельская бібліятэка” была праведзена акцыя “З кнігай радасць прыходзіць у дом”. Бібліятэкар Лілія Карпук наведала жыхароў аддаленай вёскі Кубельчыкі і чытачам былі прапанаваны новыя паступленні кніг, перыёдыка і сяброўская гутарка.



Дзень пажылых людзей выдатная нагода падарыць увагу прадстаўнікам старэйшага пакалення і падзякаваць іх за бясцэнны вопыт і мудрасць, бо яны гэта наша гісторыя. 27 верасня ў рамках сацыяльнай падтрымкі пажылых людзей аддзел абслугоўвання і інфармацыі “Воранаўскай раённай бібліятэкі” сумесна з Воранаўскай раённай ветэранскай арганізацыяй арганізавалі круглы стол для людзей сталага ўзросту. На сустрэчу запрасілі памочніка ўрача-гігіеніста Воранаўскага райЦГЭ Мяцеліцу Ірыну Іванаўну. Са словамі прывітання і віншаванняў выступілі: супрацоўнік бібліятэкі і старшыня ветэранскай арганізацыі Сазон Л.К., распавялі пра гісторыю ўзнікнення свята. Удзельнікі аматарскага аб’яднання “Надзея” змаглі атрымаць поўную інфармацыю аб здаровым ладзе жыцця, аб збалансаваным харчаванні, а таксама аб значэнні спажывання дастатковай колькасці вітамінаў і вады ў сталым узросце. Сустрэча была пабудавана ў рэжыме дыялогу, таму прысутныя атрымалі адказы на пытанні, якія цікавяць іх пытанні. Бібліятэкары арганізавалі кніжную выставу “Узрост восені выдатны”. Цёплая абстаноўка, нязмушаныя зносіны апынуліся вельмі карыснымі для людзей пенсійнага ўзросту. Нашым гасцям былі ўручаны святочныя паштоўкі з віншаваннямі. У завяршэнні сустрэчы зрабілі сумеснае фота на памяць.

## ЭКАЛАГІЧНАЕ ВЫХАВАННЕ

У філіяле “Пераганцаўская сельская бібліятэка” была праведзена гутарка-інфармацыя “Па старонках Чырвонай кнігі”.Чытачы даведаліся пра гісторыю стварэння Чырвонай кнігі, пазнаёміліся з жывёламі і раслінамі нашай краіны,

якія з’яўляюцца рэдкімі або знаходзяцца пад пагрозай знікнення. Удзельнікам мерапрыемства былі прапанаваны: віктарына “Птушкі Бацькаўшчыны” і кніжная выстава “Дзівосны свет роднай прыроды”.

## ПРАВАВОЕ ВЫХАВАННЕ

У філіяле “Радунская гарпасялковая бібліятэка” з дзецьмі Радунскага сацыяльнага прытулку праведзена гадзіна пазнання “Ты маеш права”. Мэтай дадзенага мерапрыемства было пазнаёміць дзяцей з асноўным дакументам, якія гарантуюць правы дзяцей – “Канвенцыя аб правах дзіцяці”. Наша краіна таксама падпісалася пад гэтым дакументам, а значыць паабяцала ўсяму свету клапаціцца аб сваіх маленькіх грамадзянах. У ходзе мерапрыемства бібліятэкар пазнаёміла рабят з правамі, якія гарантуе наша дзяржава: гэта – права на імя, на жыццё, на сваё меркаванне, на адукацыю. Добрым падказчыкам для дзяцей паслужыла і дзіцячая кніга пісьменніка Георгія Остера “Правы дзяцей”, які пераклаў тэкст Канвенцыі аб правах дзіцяці на зразумелы дзецям мову. Дзеці замацавалі свае веды праглядам відэроліка.

## КРАЯЗНАЎСТВА

У філіяле “Бастунская сельская бібліятэка” да Дня народнага адзінства прайшло краязнаўчае падарожжа “Любі свой край, паважай сваю гісторыю”. Бібліятэкар расказала аб тым, што кожны беларус павінен ведаць свае карані, адкуль ён родам, як жылі яго дзяды і прадзеды, якія мелі звычаі і традыцыі. Удзельнікі мерапрыемства таксама пазнаёміліся з тэматычнай выставай “Адзіная і непаўторная Беларусь”, былі экспанаваны выданні па гісторыі вобласці, грамадскага жыцця, па эканоміцы, ахове здароўя, адукацыі, навуцы, спорце і культуры, аб знакамітых людзях, славутасцях і аб турыстычных аб'ектах вобласці.